УДК 329.7:314.151.3(=161.3)

І. У. Каляда, дацэнт

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫЯ АБ'ЯДНАННІ БЕЛАРУСАЎ ЗА МЯЖОЙ І ІХ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АРЫЕНТАЦЫЯ

The article deals wiht the problems of national-cultural associtions of Belarusians abroad (in Russia, Ukraine, Baltic states, West Europe, America, Canada), main trends of their activities, their socio-political orientation. It reveals some measures taken by our state to make the relations with these organisations closer and stronger. The article also points out some difficulties which our compatriots abroad have to face and reveals the causes of their migration (today outside the Belarus lives four million our compatriot).

**Уводзіны.** Нацыя беларусаў, якая мае багатую і складаную гісторыю, уключае ў сябе не толькі грамадзян Рэспублікі Беларусь, але і шматлікія групоўкі нашых суайчыннікаў, што пражываюць практычна на ўсіх кантынентах планеты. У пачатку XXI ст. у свеце пражывала каля 12 млн. беларусаў і 4 млн. з іх – за межамі гістарычный радзімы [1].

**Асноўная частка.** У гісторыі беларускіх дыяспар можна вылучыць некалькі хваляў эміграцыі. Па-першае, пэўная колькасць нашых суайчыннікаў аказалася за межамі дзяржавы, не пакідаючы месца жыхарства. Прычынай таму з'явіўся працэс фарміравання межаў беларускай дзяржавы, у выніку якога некаторыя землі, даволі кампактна населеныя беларусамі, аказаліся ў складзе суседніх дзяржаў – гэта і Падляскі рэгіён Польшчы, і Віленскі край Літвы, і шэраг раёнаў Смаленскай вобласці РФ. Па-другое, многія беларусы пакінулі родны край у выніку напружаных гістарычных падзей канца XIX – пачатку XX стст., асеўшы ў дальніх рэгіёнах Расіі (у тым ліку Сібіры), а таксама розных краінах Еўропы, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Потым, у савецкі перыяд гісторыі, беларусы паступова рассяляліся па розных рэгіёнах Савецкага Саюза, асвойваючы цаліну. Нарэшце, у 1990-я гг. месцамі прызначэння новай эміграцкай хвалі сталі пераважна такія краіны, як Ізраіль, ЗША, Канада, Аўстралія.

У цяперашні час найбольшыя групоўкі беларусаў за мяжой пражываюць у Расіі (каля 1 млн.), ЗША (каля 500 тыс.), Украіне (каля 400 тыс.), Польшчы (каля 400 тыс.), Казахстане і Кыргызстане (112 тыс.), Канадзе (100 тыс.), Латвіі (100 тыс.), Літве (55 тыс.), Эстоніі (каля 25 тыс.). Каля 140 тыс. яўрэяў, што маюць беларускія карані, пражываюць у Ізраілі [2].

Асноўнымі задачамі дзейнасці беларускіх арганізацый за мяжой з'яўляецца аказанне сацыяльна-прававой дапамогі і садзейнічанне ў наладжванні культурных і эканамічных сувязей з этнічнай радзімай, захаванне нацыянальных і духоўных традыцый і каштоўнасцей.

Разгалінаваная структура беларускай дыяспары створана ў Расіі і Украіне. Найбольш уплывовымі беларускімі аб'яднаннямі у гэтых краінах з'яўляюцца Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія «Беларусы Расіі» і Усеўкраінскі саюз беларусаў. Аўтаномія «Беларусы Расіі» з'яўляецца формай нацыянальна-культурнага самавызначэння і уяўляе сабой грамадскае аб'яднанне грамадзян Расійскай Федэрацыі – беларусаў, якія адносяць сябе да дадзенай лучнасці на падставе іх добраахвотнай арганізацыі. Аўтаномія самастойна вырашае справы развіцця беларускай мовы, адукацыі, нацыянальнай культуры, намерваецца (згодна з яе Статутам) стварыць установы беларускай культуры, арганізоўваць калектывы самадзейнага і прафесіянальнага мастацтва. У апошнія гады актывізаваў сваю дзейнасць Маскоўскі клуб беларусаў, па ініцыятыве якога створана міжнародная арганізацыя Сусветны беларускі нацыянальны кангрэс «Сябры». Пасля Масквы пэўную актыўнасць беларускіх суполак можна назіраць у Санкт-Пецярбургу, Калінінградзе, Іркуцку і інш.

Прадстаўнікі беларускай дыяспары аказваюць непасрэдную фінансавую дапамогу ў многіх працктах. Напрыклад, на сродкі М. Грыба ў 2005 г. быў створаны помнік Ф. Скарыне ў Калінінградзе, І. Панасюк і яго калегі з Навасібірска пабудавалі храм Ефрасінні Полацкай. Адна з галоўных праблем дыяспары – недахоп інфармацыі як з Беларусі, так і з рэгіянальных арганізацый і суполак. Для вырашэння гэтай праблемы ў Маскве пачалі выдаваць свой бюлетэнь «Белорусы России», а Федэральная нацыянальна-культурная аўтаномія наладзіла выпуск штотыднёвай газеты з аналагічнай назвай. Акрамя таго, выдаюцца газета Новасібірскай гарадской арганізацыі «Мая Радзіма», Літаратурна-этнаграфічны альманах беларусаў Дона «Мы – славяне».

Шмат цікавых і карысных спраў на рахунку Ўсеўкраінскага саюза беларусаў – канферэнцыя па пытаннях развіцця беларускай меншасці ва Украіне, выданне зборніка вершаў беларускага паэта з Крыма І. Літаша, адкрыццё класса-ліцэя па вывучэнні беларускай мовы ў школе № 12 г. Ірпень Кіеўскага раёна і інш. Адным з першых узнікла Крымскае беларускае культурна-асветнае таварыства, якое сёння налічвае ў сваім складзе 350 сябраў. Яны прадстаўляюць амаль 60 тыс. беларусаў – жыхароў Крыма [3]. У адпаведнасці са Статутам таварыства, асноўная яго мэта – развіццё рознабаковых сувязей паміж

беларускім і ўкраінскім народамі, прапаганда беларускай нацыянальнай культуры, мастацтва, народнай творчасці. Для вырашэння гэтай задачы штогод таварыства праводзіць у Ялце і Сімферопалі фестывалі беларускай культуры, перыядычна арганізуюцца мастацкія выставы («Сінявокая Беларусь», «Чарнобыльскі боль»). Наогул, трэба заўважыць, што адметнай рысай беларускіх суполак ва Украіне (акрамя прыгаданых, гэта гурт беларускай культуры «Зорка Венера» у г. Ізяслау Хмяльніцкай вобл., Данецкая гарадская арганізацыя «Нёман», нацыянальна-культурнае таварыства беларусаў «Белая Русь» у Харкаве, нацыянальна-культурнае аб'яднанне «Беларусь» у Адэсе і інш.) з'яўляецца прыхільнасць да культурнай дзейнасці, самадзейнай мастацкай творчасці. Іншыя кірункі – вывучэнне роднай мовы, гісторыі, асветніцтва ўвогуле, эканамічныя сувязі – прыцягваюць значна менш увагі нашых суайчыннікаў у гэтай краіне.

Пры параўнальнай нешматлікасці беларускай дыяспары ў Літве, Латвіі, Эстоніі дзейнасць нашых суайчыннікаў у гэтых краінах адрозніваецца актыўным разнастайным, але пры гэтым і супярэчлівым характарам. Не заўсёды ўзважлівая нацыянальная палітыка кіраўніцтва гэтых краін з'яўляецца стымулам для самаарганізацыі найбольш актыўнай часткі беларускай супольнасці, якая імкнецца захаваць сваю самабытнасць. У Вільнюсе дзейнічае сярэдняя школа імя Ф. Скарыны з навучаннем на беларускай мове, настаўнікі якой павышаюць сваю кваліфікацыю ў Беларусі. Для вучняў арганізуюцца інфармацыйна-пазнаваўчыя паездкі у нашу рэспубліку, аздараўленне, выпускнікі школы паступаюць на бюджэтную форму навучання ў беларускія ВНУ. На факультэце славістыкі Вільнюскага педагагічнага універсітэта створана кафедра беларускай літаратуры і этнакультуры, якая падтрымлівае адукацыйныя і навуковыя сувязі з Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя М. Танка. Апошнім часам амаль ва ўсіх рэгіёнах Літвы дзейнічаюць каля 20 беларускіх суполак, якія згуртаваліся ў Аб'яднанне беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы. Намаганнямі суполак па ўсёй краіне штогод ладзяцца беларускія культурныя святы (Каляды, Вялікдзень, Купалле), праводзіцца Ўселітоўскае свята беларускай песні. У большасці культурна-асветнай працай займаюцца беларускія суполкі Эстоніі – гэта Згуртаванне беларусаў Эстоніі «Бацькаўшчына», Беларуская культурная суполка «Фэст» (Талін), Беларуска-эстонскае культурна-асветнае таварыства «Спадчына», таварыства «Сябры» (Нарва) і інш. Нягледзячы на даволі складаную моўную сітуацыю ў Латвіі (у 2004 г. толькі 19% латышскіх беларусаў у якасці роднай мовы назвалі беларускую), можна з упэўненасцю казаць аб існаванні інфраструктуры ўласнай беларускай культуры. Стала працуюць пяць культурных таварыстваў: «Світанак» і «Прамень» у Рызе, «Уздым» у Даўгаўпілсе, «Мара» у Ліепае і «Спадчына» у Вентспілсе. З 1991 г. у Латвіі аднавілася навучанне на беларускай мове. Спачатку была заснавана Рыжская беларуская нядзельная школа, затым, у 1994 г., на яе базе была адчынена дзяржаўная Рыжская асноўная беларуская школа. Акрамя таго, існуе нацыянальная праграма Латвійскага радыё «Домская плошча» – менавіта для беларусаў. Таксама выдаецца газета беларусаў Латвіі – «Прамень» (дарэчы, беларуская дыяспара – адзіная ў краіне, якая мае ўласную газету).

У Кыргызстане, Узбекістане і Казахстане беларуская дыяспара сфарміравалася ў асноўным у пасляваенныя гады. Грамадскія арганізацыі колькасна невялікія і складаюцца пераважна з людзей старэйшага пакалення. Найбольшым аўтарытэтам у Казахстане карыстаюцца Нацыянальны культурны цэнтр «Беларусь» (Алматы), грамадскае аб'яднанне «Культурны цэнтр "Беларусь"» (Астана). У Кыргызстане дзейнічае дзве арганізацыі беларусаў: Грамадскае аб'яднанне беларусаў у Кыргызскай Рэспубліцы «Світанак» і Беларускі культурны цэнтр «Крыніца». Найбольш уплывовым з'яуляецца «Світанак», які структурна ўваходзіць у склад Асамблеі народаў Кыргызстана – кансультацыйна-дарадчы орган па пытаннях міжнацыянальных адносін пры прэзідэнце Кыргызскай Рэспублікі. Зараз «Світанак» разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальных аб'яднанняў удзельнічае ў круглых сталах, канферэнцыях, прысвечаных пытанням нацыянальнага будаўніцтва і рэалізацыі пытанняў сцвярджэння сваёй нацыянальнай самабытнасці. Нацыянальна-культурнае аб'яднанне беларусаў ва Узбекістане – Беларускі культурны цэнтр «Світанак» – ажыццяўляе сваю дзейнасць у рамках рэспубліканскага інтэрнацыянальнага культурна-асветніцкага цэнтра.

Развітыя арганізацыйныя формы стварылі беларусы Польшчы. Найбольшай актыўнасцю і аўтарытэтам карыстаюцца Беларускае грамадска-культурнае таварыства і Беларускае аб'яднанне студэнтаў (усяго ж у Польшчы дзейнічае 19 арганізацый і устаноў беларускай меншасці) [4]. Сёння прававы статус беларусаў у Польшчы рэгулюе прыняты ў студзені 2005 г. Сеймам Польшчы «Закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях і аб рэгіянальнай мове», згодна якому прадугледжваецца абавязак органаў дзяржаўнай улады выдзяляць адпаведныя сродкі для падтрымкі дзейнасці, скіраванай на ахову, утрыманне і развіццё культурнай тоеснасці меншасці. Трэба адзначыць, што галоўнае месца ў рабоце беларускіх арганізацый і ўстаноў у Польшчы займае культурна-мастацкая дзейнасць. Толькі БГКТ штогод праводзіць каля 80 розных культурна-масавых мерапрыемстваў

(агульнапольскія фестывалі беларускай песні, конкурсы беларускай паэзіі, фестывалі царкоўнай музыкі і інш.).

Адначасова трэба адзначыць, што сённяшні стан вывучэння беларускай мовы жадае быць лепшым. Беларуская мова выкладаецца толькі як прадмет для вывучэння ў некаторых базавых школах і ліцэях. У адрозненні ад палякаў, што жывуць у Беларусі, польскія беларусы не выстаўляюць патрабавання аб стварэнні беларускіх школ. Аднак у Варшаўскім універсітэце ўжо больш за трыццаць год працуе кафедра беларускай мовы і літаратуры, дзе спецыялізацыю праходзяць 10–20 студэнтаў (штогод выконваюцца дыпломныя працы не толькі па беларускай філалогіі, але і па гісторыі і па сучасным развіцці Рэспублікі Беларусь). У Беластоцкім універсітэце працуе кафедра беларускай філалогіі і кафедра беларускай культуры.

Калоніі беларусаў ёсць і у Цэнтральнай і Заходняй Еўропе – Велікабрытаніі, Францыі, Германіі, Чэхіі, праўда, яны не вельмі шматлікія. Аднак тут сканцэнтравалася ў асноўным палітычная эміграцыя, інтэлігенцыя беларускага замежжа, якая выказвае пэўную актыўнасць у грамадска-палітычнай, культурнай і навуковай сферах. Сусветным цэнтрам інтэлігенцыі беларускай дыяспары з'яўляецца Лондан, дзе функцыянуе Асацыяцыя беларусаў Англіі, якая стварыла тут «Беларускі цэнтр» з буйной бібліятэкай.

Своеасаблівасцю адрозніваецца дзейнасць арганізацый беларусаў у Амерыцы перш за ўсё з-за палітычнай і арганізацыйнай разлучанасці розных хваляў эмігрантаў. Да ліку найбольш уплывовых беларускіх арганізацый у ЗША і Канадзе адносяцца: «Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне», «Беларускі кангрэсавы камітэт», «Арганізацыя беларуска-амерыканскай моладзі», «Згуртаванне беларусаў Канады». Галоўнай іх мэтай стала дзейнасць па развіцці беларускіх нацыянальных і культурных традыцый, а таксама імкненне атрымаць падтрымку з боку шырокіх колаў амерыканскага грамадства і Урада ЗША ў прызнанні незалежнасці Беларусі. Пасля 1986 г. энэргія амерыканскіх беларусаў скіравана на арганізацыю дапамогі ахвярам Чарнобыля. Створана каля дзесяці камітэтаў дапамогі. Там, дзе беларусы пражываюць больш-менш кампактна, як, напрыклад, у штатах Нью-Йорк, Нью-Джэрсі, Пенсільванія, яны, як правіла, маюць свае асяродкі, сваю царкву або касцёл, крамы, кассы ўзаемадапамогі, культурныя цэнтры, пры якіх ёсць бібліятэкі, школы, музеі. Важнымі падзеямі у жыцці беларускай іміграцыі з'яўляюцца Сустрэчы беларусаў у Пауночнай Амерыцы, якія арганізуюцца кожныя два гады, пачынаючы з 1952 г.

**Заключэнне.** Беларуская дзяржава аказвае падтрымку суайчыннікам, што пражываюць за мяжой. Гэта і дзейнасць пасольстваў Рэспублікі Беларусь, і стварэнне міжнароднага спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь-ТВ», і работа галоўнай дырэкцыі замежнага вяшчання (радыёстанцыя «Беларусь»), і выданне беларускамоўнай газеты «Голас Радзімы» (распаўсюджваецца ў 52 краінах), і шмат іншае.

Прыярытэтнымі накірункамі дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах да дыяспары з'яўляецца аб'яднанне ўсіх суайчыннікаў у свеце, уключэнне прадстаўнікоў дыяспары ў эканамічнае супрацоўніцтва, падтрымка і развіццё нацыянальнай культуры. У рэспубліцы распрацоўваецца спецыяльны закон аб суайчынніках, якія жывуць за мяжой. Ён на заканадаўчым узроўні дазволіць прапісаць механізмы абароны правоў беларусаў ва ўсіх кутках свету, забяспечыць іх трывалую сувязь са сваёй гістарычнай радзімай.

## Літаратура

1. Беларуская дыяспара: нарысы гісторыі і сучаснай літаратуры / пад рэд. В. П. Грыцкевіча. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 7.

2. Роля беларускай дыяспары ў захаванні і развіцці беларускай культуры / пад рэд. В. Л. Кіпель. – Мінск: Вышэйшая школа, 2004. – С. 4–5.

3. Сяргеева, Г. Беларуская дыяспара: погляд на мінулае і сучаснасць / Г. Сяргеева // Голас Радзімы. – 1997. – 27 лістапада.

4. Беларуская дыяспара як пасрэдніца ў дыялогу цывілізацый / пад рэд. Л. І. Пранчак. – Мінск, Вышэйшая школа, 2001. – С. 70.